# МІНУЛАЕ Ў РЫТМАХ СУЧАСНАСЦІ

**Шэраг цікавых імпрэзаў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі ладзіць з улікам тых датаў і падзей, якімі жыве краіна сёння**

Гэты будынак па мінскай вуліцы Карла Маркса, 12 многія ведаюць па вялікіх чорных гарматах, што ляжаць пры ўваходзе. Сёлета ў Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі — 100-гадовы юбілей: бо вядзе ж ён гісторыю ад Мінскага абласнога музея — першага беларускага дзяржаўнага музея (1919–1923). Адкрыўся ён у будынку былога Дваранскага сходу, што стаяў на скрыжаванні сучасных вуліц Маркса і Энгельса — той будынак у плыні часу не ацалеў.

Цяпер у зборах музея — больш за 460 тысяч адзінак захоўвання з улікам збораў філіялаў. Гэта, у прыватнасці, скарбы з розных куткоў Беларусі, каштоўныя дакументы, старадрукі, слуцкія паясы, калекцыя музінструментаў, мэблі, зброі, каштоўнага парцалянавага посуду і шмат чаго яшчэ. У Гістарычнага музея ёсць 5 філіялаў: Дом-музей І з'езда РСДРП, Музей гісторыі беларускага кіно, Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, Музей прыроды і экалогіі Беларусі, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Так сталася, што самы першы дзяржаўны музей узначальвае, пэўна, самы малады кіраўнік падобных установаў: 26 гадоў было культуролагу Паўлу Сапоцьку, калі на пачатку красавіка 2018-га ён заступіў на пасаду. І, дарэчы, казаў у адным з першых інтэрв'ю з тае нагоды, што людзі — найважней за любую найбагатую калекцыю. Да таго ж мая калега не прамінула слушна ўспомніць, як творча, крэатыўна праявіў сябе Павел Міхайлавіч, тры гады перад тым ачольваючы Мастацкую галерэю «Універсітэт культуры». Спрагназавала, што «ад яго можна чакаць нестандартных ідэй, як пяднаць дзень сённяшні з артэфактамі нашай гісторыі». А як тое ўдаецца — вынікае з нашае размовы з Паўлам Сапоцькам.




Павел Сапоцька

***— Спадар Павел, прайшоў год, як вы ўзначалілі Гістарычны музей. Зразумела ж, даводзіцца на такой пасадзе і ўлічваць досвед папярэднікаў, і прыўносіць нешта новае ў працу. Як дасягаеце гармоніі, балансу мінулага і сучаснасці?***

— Ведаеце, па вялікім рахунку кожны чалавек і ёсць такі баланс… Мы памятае свае карані, шануем родную культуру, якой тысячы гадоў — і ў той жа час імнемся развівацца, штодзень асвойваць новыя тэхналогіі, працаваць у рытме сённяшняга часу. Трымаем баланс усё жыццё. І ў музеі так: зберагаем мінуўшчыну — аднак імкнемся ўпісацца ў сучасны кантэкст, быць запатрабаванымі ў грамадстве. Як кажуць, не парасці мохам і павуцінай. Адзін з найбольш лагічных і запатрабаваных выхадаў музея на шырокі кантакт з аўдыторыяй — гэта выставачная дзейнасць. Назбіранае павінна не пыліцца недзе ў сховах, а працаваць на карысць Бацькаўшчыны. Цяпер, мяркую, у нашай дзейнасці ёсць жыццяздольны баланс гісторыі, літаратуры й мастацтва. Дарэчы, калі я прыйшоў у музей, то на першай планёрцы сказаў: нягледзячы на тое, што ў нас Нацыянальны гістарычны музей — на гэтай пляцоўцы павінен адбывацца сінтэз і дыялог нацыянальнай гісторыі, айчыннага выяўленчага мастацтва і літаратурнай спадчыны Беларусі. У любым выпадку мы развіваемся ў гістарычным кантэксце, але шукаць новыя формы працы, выхаду ў свет, вібраваць у рытмах сённяшняга часу з усімі нашымі каштоўнымі зборамі — вельмі цікава. Тым больш у пару, калі — ну так

склался! — юбілей за юбілеем. Мы на іх адгукаемся і робім розныя выставы, у тым ліку і мастацкія. Цяпер у нас задумаў — мора! Нешта здзейснілі: маю на ўвазе выставачныя праекты. На ўскідку: зрабілі выставу «100 гадоў беларускай дыпламатычнай службе». Прыйшло на адкрыццё тае выставы шмат знакамітых людзей, усё было святочна і ўрачыста. Зладзілі выставу да 115-годдзя опернай спявачкі, рэжысёра, народнай артысткі БССР і СССР Ларысы Александроўскай. Зусім нядаўна адкрылася выстава да 100-годдзя БССР, цяпер у рабоце праекты да 200-годдзя кампазітара Станіслава Манюшкі, да 100-годдзя ЛКСМ Беларусі...

***— Акрамя выстаў — якія ў музея ёсць выхады на аўдыторыю?***

— У нас праходзяць і творчыя сустрэчы, аўтарскія вечарыны, ёсць і выдавецкія праекты. Імкнемся розныя пласты айчыннай гісторыі прыпадняць, актывaваць, калі казаць моваю ІТ-тэхналогій, ды паказаць шырокаму колу суграмадзян, гасцей Беларусі. Нам важна глыбока даследаваць і цікава, сучаснаю моваю расказаць пра нашу вялікую спадчыну — як матэрыяльную, так і духоўную. Розныя формы практыкуем.

***— З прэс-рэлізаў, якія музей дасылае ў рэдакцыі СМІ, бачна: у вас цяпер шмат і розных міжнародных праектаў...***

— Тут, заўважу, два напрамкі дзейнасці. Першы: рэалізацыя праграм на базе самога Гістарычнага музея, нашых філіялаў. Другі: папулярызацыя гістарычна-культурнай спадчыны Беларусі за межамі краіны. Скажам, у 2018 годзе мы паказалі цікавыя выставы у Нацыянальным музеі султаната Аман (у горадзе Маскаце). Была выстава ў Нацыянальным музеі Літвы (Вільнюс) — мы там прымалі ўдзел у фотавыставе, прысвечанай Льву Дашкевічу. Гэта быў беларускі фотамастак, навуковец, вынаходнік, публіцыст, педагог. Здымаў сярод іншых вядомых асоб і Янку Купалу. Здымкі, творы Льва Дашкевіча знаходзяцца ў фондах розных музеяў, і ў нашым таксама. Былі ў нас яшчэ сумесныя праекты з Польшчай. Мы паўдзельнічалі ў Днях культуры Беларусі ў Пермскім краі: вазілі ў Расію інфармацыйна-дакументную выставу «Беларусь і беларусы», а таксама «Беларусь сучасная».

***— Цікава, ці жывуць там беларусы?***

— Так, жывуць! І яны былі запрошаны ў канцэртную залу на святочны канцэрт, які ладзіла Беларуская дзяржфілармонія пры падтрымцы Мінкультуры. Былі ў нас і шматлікія іншыя праекты. У тым ліку мы прымаем розныя выставы ў сябе. Скажам, прадставілі выставу майстроў народных промыслаў В'етнама. Была выстава з фондаў музеяў Татарстана (Расія). Вельмі цікавай атрымалася выстава «Біяграфіі 100 дамоў Пярну» (Эстонія) — прысвячалася 100-годдзю Эстонскай Рэспублікі. Надзвычай цікавыя выставы ладзім з Інстытутам польскім пры падтрымцы Амбасады Польшчы. Паказалі, напрыклад, праект «Знакі незалежнасці» — выставу польскіх грошай: да 100-годдзя аднаўлення незалежнасці Польскай Рэспублікі.

***— Мы ведаем, што перад рэвалюцыяй вялікая калекцыя старажытнасцяў графа Эмерыка фон Гутэн-Чапскага была з-пад Мінска вывезена ў Кракаў. Цяпер зберагаецца там у Музеі імя Гутэн-Чапскіх. Ці не прыязджалі таксама і адтуль грошы?***

— Не, на вялікі жаль. Хоць, як вядома, у гісторыі беларусаў і палякаў шмат агульных старонак, вядомых асоб, і графы Чапскія — з іх ліку. І, дарэчы, мы пачынаем працу з Кракавам дзякуючы мясцоваму Гістарычна-культурнаму дабрачыннаму фонду «Ляліва», які займаецца зберажэннем, аднаўленнем спадчыны Гутэн-Чапскіх. Дырэктар фонду — Іван Іванавіч Гардзіеўскі, ён жа віцэ-старшыня Мінскага саюза прадпрымальнікаў і працаўдаўцаў. Працуем актыўна і з расійскімі, а таксама кітайскімі калегамі. У прыватнасці, сёлета далучаемся да праектаў, прысвечаных 70-годдзю стварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. Наша першая міжнародная імпрэза-2019 была прысвечана Кітаю, дакладней — кітайскай архітэктуры. Наш сябар, прафесар, доктар архітэктуры Армен Сардараў прадставіў вельмі цікавую выставу ўласных фотаздымкаў, на іх — як традыцыйная народная архітэктура, так і сучасныя дасягненні яго калег з Паднябеснай. Паказалі яшчэ экспанаты з калекцыі Кітайскага культурнага цэнтра, які створаны, дзейнічае на базе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — у якім выкладае Армен Сяргеевіч. Летась, дарэчы, мы падпісалі некалькі дамоў пра беларуска-кітайскае супрацоўніцтва: з Шанхайскім гістарычным музеем, з Фінансавым музеем правінцыі Шэньянь. І прымалі напрыканцы года, у снежні 2018-га, дэлегацыю прадстаўнікоў



TIMES.BNTU.BY

Так адкрывалася выстава, прысвечаная кітайскай архітэктуры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнароднай Шанхайскай культурнай асацыяцыі. Пры той асацыяцыі ёсць вельмі цікавыя калекцыі твораў жывапісу, каліграфіі, графікі. Спадзяюся, што сёлета мы іх таксама прадэманструем для беларускай публікі. Для нас цікавыя й сумесныя праекты. Скажам, з польскімі калегамі зробім разам выставу, на якой прадставім і беларускіх іканапісцаў, і польскіх.

***— Гэта будзе іканапіс прадстаўнікоў розных веравызнанняў?***

— Так, розных. З Польшчай будзем працаваць і дзеля папулярызацыі музычнай, літаратурнай спадчыны Станіслава Манюшкі. Мы ганарымся, што сёлета пад гэтую справу атрымалі грант Прэзідэнта Беларусі дзеячам адукацыі, навукі, аховы здароўя й культуры. Праект думаем рэалізаваць у дзвюх частках. Гэта будзе навукова-практычная канферэнцыя, а таксама перасоўная выстава — на базе філіяла «Музей гісторыі тэатральна-музычнай культуры». Выставу плануем паказаць і ў беларускіх рэгіёнах, і ў Дзелавым і культурным комплексе пры Пасольстве Беларусі ў Маскве. Там жа пакажам выставу «Жанчыны Беларусі» ды зробім праект да юбілею знакамітага дыпламата-беларуса Андрэя Грамыкі.

***— Як бачна, праца з замежжам разгортваецца ў Гістарычнага музея актыўна...***

— Сапраўды, гэта важны кірунак дзейнасці. Вось у красавіку выставу, прысвечаную нашаму слыннаму земляку Напалеону Ордзе, вязем у Абласны гістарычны музей Калінінграда. Дамоўленасць дасягнута раней. Прыязджалі адтуль спецыялісты, зацікавіліся нашай калекцыяй дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва. У тым ліку й творчай спадчынай Напалеона Орды. У нас ёсць арыгінальныя працы, мы іх экспануем і ў іншых музеях Беларусі — скажам, у Нацыянальным мастацкім музеі. Летась такім чынам дзяліліся творамі як Язэпа Драздовіча, так і Напалеона Орды. Была выстава ў Магілёве — туды завезлі творы Паўла Васілевіча Масленікава. Як бачым, нашы калекцыі — вельмі жывыя. Хоць перад намі стаіць галоўная задача: вывучыць, захаваць, рэстаўраваць і «нікому не даць» (ёсць такое правіла фандавіка), але тым не менш — і прадэманстраваць, і паказаць. Прычым вось гэты момант папулярызацыі ў нашай працы вельмі важны. І мы ганарымся тым, што нашы фонды штогод прырастаюць на 2–4 тысячы экспанатаў. Сярод іх і творы выяўленчага мастацтва.




На адкрыцці выставы «100 гадоў беларускай дыпламатычнай службе» кіраўнік МЗС Беларусі Уладзімір Макей і Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган урачыста загасілі юбілейны паштовы блок

***— Ці шмат у Гістарычным музеі калекцый?***

— Больш за 50 з улікам філіялаў, і кожная пастаянна папаўняецца, яна жывая, цікавая. Цяпер стаіць перад намі задача: не толькі паказаць назбіранае ў музеях, але й на гэтай аснове рэалізаваць розныя выдавецкія праекты. Юры Лаўрык, адзін з навуковых супрацоўнікаў, вядзе калекцыю старадрукаў, рарытэтных выданняў. Ён падрыхтаваў матэрыялы — разглядаем, і можа выдадзім зборнікам артыкулаў. Ці манаграфіяй, альбомам — бо вельмі гэта цікавы ілюстрацыйны матэрыял на тэму «Кніжная культура Беларусі». Частка фондаў Гістарычнага музея, прысвечаных кніжным выданням, цяпер знаходзіцца у Нацыянальнай бібліятэцы: там створаны добрыя ўмовы захоўвання. І там ёсць нашы супрацоўнікі. Мы ганарымся нашымі калекцыямі, да таго ж працуем і з партнёрамі. Гады паўтары таму я сустрэўся з Мітрапалітам Тадэвушам Кандрусевічам. І тады ў мяне нарадзілася думка: зрабіць выставу каталіцкага мастацтва — у Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», дзе тады працаваў. У хуткім часе мяне прызначылі ў Нацыянальны гістарычны музей, але ж ідэя засталася. І 14 лютага ў нас адкрылася цікавая выстава «Сакральная культура Касцёла Беларусі»: яна доўжылася месяц. Прысвячалася артэфактам каталіцкай айчыннай культуры, калі можна так казаць. Выкарыстаны былі творы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея, Нацыянальнага мастацкага музея, Нацыянальнай бібліятэкі, прыватныя калекцыі. Гэта, у прыватнасці, зборы Ігара Сурмачэўскага — цудоўнага мастака й рэстаўратара, калекцыянера. Я быў уражаны ягонай калекцыяй. Прадставілі экспанаты й беларускія касцёлы Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі: далі нам іх на часовае карыстанне. Гэта мінскі Залатагорскі касцёл, Будслаўскі касцёл Божай Маці, касцёлы Стаўбцоўскага і Лагойскага раёнаў, з Гродна экспанаты. Вельмі ўсё цікава: іканапіс, жывапіс, арнаты, куфры, кнігі, падсвечнікі...

***— Чым занятыя цяпер?***

— У працы шмат праектаў. Адзін са знакавых: напрыканцы сакавіка пройдзе адкрыццё выстава «1919. Беларуская Рэспубліка» — да 100-годдзя БССР і 95-годдзя беларусізацыі. Гэта і культурная, і асветніцкая акцыя. Робім яе праз арыгінальную падачу матэрыялаў. Навуковая канцэпцыя — наша, падключыліся архівы, бібліятэкі ды іншыя музеі.

Гутарыў Іван **Ждановіч**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ